Учреждение образования
«Витебский государственный университет им. П.М.Машерова»

УДК 377.016:8

На правах рукописи

Н-261

**Чикованова Екатерина Анатольевна**

# ТЭХНАЛОГІЯ ДЫФЕРЭНЦЫРАВАНАГА НАВУЧАННЯ Ў ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ ВА ЎМОВАХ ПЕДАГАГІЧНАГА КАЛЕДЖА

13.00.01. – общая педагогика, история педагогики и образования

Диссертация на соискание академической степени
магистра педагогических наук

Научный руководитель –
кандидат педагогических наук,
доцент Загорулько Р.В.

Установа адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны універсітэт
імя П.М.Машэрава»
НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА

Витебск, 2005

# ПЛАН

**Уводзіны** .......... 3

Глава 1. **Тэарэтычныя асновы праблемы тэхналогіі дыферэнцыраванага навучання**

1.1. Сутнасць і спецыфіка тэхналогіі дыферэнцыраванага навучання .......... 7

1.2. Этапы развіцця і сучасны стан дыферэнцыраванага навучання .......... 20

Глава 2. **Асаблівасці працэсу ўкаранення тэхналогіі дыферэнцыяцыі ў практычную дзейнасць выкладчыка педагагічнага каледжа**

2.1. Арганізацыйны аспект дыферэнцыраванага навучання .......... 27

2.2. Метадычны аспект дыферэнцыраванага навучання .......... 38

**Заключэнне** .......... 52

**Спіс выкарыстаных крыніц** .......... 55

**Дадаткі**

# УВОДЗІНЫ

**Актуальнасць тэмы даследавання**

Галоўнай мэтай кожнага гуманістычнага грамадства з'яўляецца ўсебаковае і гарманічнае развіццё кожнай асобы. Дасягненне гэтай мэты – задача надзвычай складаная, бо вымагае стварэння ў вучэбных установах спецыяльных умоў для кожнага канкрэтнага навучэнца. Неабходна ўлічваць той факт, што выпускнікі ўстаноў адукацыі павінны валодаць універсальнымі ўменнямі: ставіць мэту сваёй дзейнасці, рабіць самастойны выбар у пэўных сітуацыях, валодаць рэфлексіяй і інш. Спецыяльных прадметаў, на якіх вучні авалодваюць вышэй пералічанымі ўменнямі, няма. Задаволіць іх патрэбу ў падрыхтоўцы да жыцця, адэкватным рэагаванні на змены ў навакольным свеце дапамагаюць заняткі, пабудаваныя на прынцыпах асобасна-арыентаванага навучання, якое рэалізуецца ў межах разнастайных адукацыйных тэхналогій [8, 12, 18, 22, 42].

Індывідуальна-тыпалагічныя асаблівасці вучняў, формы іх узаемадзеяння, разнастайнасць у пабудове вучэбнага працэсу ўлічвае тэхналогія дыферэнцыраванага навучання. Укараненне тэхналогіі дыферэнцыраванага навучання прадугледжвае выкарыстанне рознаўзроўневых праграм навучання, адпаведных метадаў і прыёмаў, заданняў, распрацаваных з улікам узроўняў навучання. Аднак неабходна адзначыць, што дадзеныя сродкі навучання ў гатовым выглядзе адсутнічаюць. Таму вельмі важна валоданне педагогам тэхналогіяй дыферэнцыраванага навучання на ўзроўні прафмайстэрства, гэта значыць уменне самастойна распрацаваць сродкі, якія садзейнічаюць эфектыўнаму выкарыстанню дадзенай тэхналогіі на практыцы.

Выкарыстанне тэхналогіі дыферэнцыраванага навучання на ўроках беларускай мовы і літаратуры найбольш эфектыўнае ва ўмовах педагагічнага каледжа, бо на першы курс прыходзяць навучэнцы рознага ўзроўню падрыхтоўкі; дыферэнцыяцыя дапамагае ўлічваць такія асаблівасці і рацыянальна планаваць працэс навучання.

Дыферэнцыяцыя ў навучанні і адукацыі – гэта арганізацыя вучэбнай дзейнасці, пры якой з дапамогай адбору зместу, форм, метадаў, тэмпаў, аб'ёму навучання ствараюцца аптымальныя ўмовы для засваення ведаў кожным вучнем [20, с. 39]. Вельмі важнай тэарэтычнай і практычнай задачай з'яўляецца вызначэнне зместу, метадаў, прыёмаў, форм навучання ў адпаведнасці з уласцівасцямі асобы, якія ў найбольшай ступені ўплываюць на навучальную работу і ў той жа час праяўляюцца ў ёй.

Менавіта гэтыя погляды і з'явіліся асновай для вызначэння **тэмы** даследавання: "Тэхналогія дыферэнцыраванага навучання ў працэсе выкладання беларускай мовы і літаратуры ва ўмовах педагагічнага каледжа".

**Мэта** даследавання – выяўленне асаблівасцей укаранення тэхналогіі дыферэнцыраванага навучання ва ўмовах педагагічнага каледжа і распрацоўка арганізацыйнага і метадычнага аспектаў дыферэнцыраванага навучання беларускай мове і літаратуры.

Аснову даследавання склала **гіпотэза** аб тым, што выкарыстанне тэхналогіі дыферэнцыраванага навучання ва ўмовах педагагічнага каледжа можа быць эфектыўным у тым выпадку, калі педагог валодае неабходнай тэарэтычнай і практычнай падрыхтоўкай, у працэсе навучання ўлічваюцца індывідуальныя асаблівасці кожнага навучэнца, распрацаваныя спецыяльныя вучэбна-метадычныя комплексы для ўзроўневага навучання.

**Задачамі** дадзенага даследавання з'яўляюцца:

- вызначэнне сутнасці і спецыфікі тэхналогіі дыферэнцыраванага навучання;
- аналіз гістарычнага развіцця і сучаснага стану дыферэнцыраванага навучання;
- выяўленне арганізацыйнага аспекту дыферэнцыраванага навучання ва ўмовах педагагічнага каледжа;
- распрацоўка метадычнага забеспячэння дыферэнцыраванага падыходу да выкладання беларускай мовы і літаратуры ў педагагічным каледжы.

**Аб'ектам** даследавання з'яўляецца тэхналогія дыферэнцыраванага навучання, **прадметам** – педагагічныя асновы арганізацыі тэхналогіі дыферэнцыраванага навучання ў педагагічным каледжы ў працэсе выкладання беларускай мовы і літаратуры.

**Метадалагічнай асновай** даследавання з'яўляюцца вядучыя ідэі ў працах педагогаў і псіхолагаў аб станоўчай ролі дыферэнцыраванага навучання; дыялектычны падыход да вывучэння фактаў і з'яў, разумення сутнасці педагагічнага працэсу і палажэнне аб тым, што яго развіццё прагрэсіўнае і ў яго арганізацыі вядучая роля адводзіцца выкладчыку, яго супрацоўніцтву з навучэнцамі, якія, у сваю чаргу, выступаюць суб'ектамі навучальнай дзейнасці.

Для вырашэння пастаўленых задач і праверкі гіпотэзы прымяняліся тэарэтычныя, дыягнастычныя і эмпірычныя метады даследавання.

**Тэарэтычныя метады**: вывучэнне і аналіз педагагічнай і метадычнай літаратуры па даследуемай праблеме.

**Дыягнастычныя**: вывучэнне і аналіз вучэбных праграм, планаў, псіхолага-педагагічных асаблівасцей навучэнцаў.

**Эмпірычныя**: педагагічнае назіранне, гутаркі з навучэнцамі, выкладчыкамі, інтэрв'юіраванне, анкетаванне.

**Навуковая навізна атрыманых вынікаў у наступным:**

- канкрэтызаваны патрабаванні да арганізацыйнага і метадычнага аспектаў дыферэнцыраванага навучання ва ўмовах педагагічнага каледжа;
- раскрыта сутнасць і спецыфіка найбольш эфектыўных метадаў, прыёмаў і сродкаў навучання пры дыферэнцыяцыі на ўроках беларускай мовы і літаратуры.

**Практычная значнасць** заключаецца ў распрацоўцы рознаўзроўневай рабочай праграмы па беларускай мове, анкет, што дазваляюць выкладчыку літаратурную падрыхтаванасць навучэнцаў, якая з'яўляецца крытэрыем да падзелу іх на групы, апор, схем, памятак, практычных заданняў з улікам узроўняў навучання, неабходных для ажыццяўлення дыферэнцыраванага падыходу, у раскрыцці патэнцыяльных магчымасцей дыферэнцыраванага навучання ў паляпшэнні паспяховасці навучэнцаў.

**Асноўныя палажэнні**, вынасімыя на абарону:

1. Асноўнымі фактарамі, якія абумоўліваюць дыферэнцыяцыю навучання з'яўляюцца індывідуальныя асаблівасці навучэнцаў, што вызначаюцца сукупнасцю асобасных, узроставых, прыродных уласцівасцей, і галіновая будова культуры.
2. Істотнымі ўмовамі для працякання працэсу дыферэнцыраванага навучання з'яўляюцца: улік індывідуальных асаблівацей навучэнцаў у вучэбнай рабоце; перспектыўнае планаванне іх дзейнасці; уменне аналізаваць работу дзяцей; уменне ўдасканальваць здольнасці і навыкі навучэнцаў пры кіраўніцтве іх навучальнай дзейнасцю.
3. Для эфектыўнага выкарыстання тэхналогіі дыферэнцыяцыі на ўроках беларускай мовы і літаратуры, акрамя іншых (агульных), неабходна ўлічваць і спецыфічныя фактары, абумоўленыя ўласцівасцямі вучэбных дысцыплін, сярод іх такія, як матывацыя навучэнцаў, літаратурная і моўная падрыхтаванасць, вядучы кампанент зместу вучэбнага прадмета, асаблівасці шляхоў засваення ведаў на кожнай канкрэтнай вучэбнай дысцыпліне; узровень маральнай, эстэтычнай, культурнай выхаванасці; каштоўнасна-маральныя арыентацыі навучэнцаў; ступень хуткасці ў засваенні новага матэрыялу; уменне прымяняць атрыманыя веды ў розных сітуацыях; уменне працаваць з літаратурай рознага характару.

Работа змяшчае змест, уводзіны, дзве главы, заключэнне, спіс выкарыстаных крыніц, дадаткі. Аб'ём работы 58 старонак.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** У працэсе работы над над дысертацыйным даследаванне аўтарам прааналізаваны шэраг літаратурных крыніц па вывучаемай тэме; акрэслена спецыфіка арганізацыі дыферэнцыраванага навучання; вызначаны прыёмы і сродкі арганізацыі навучання, неабходныя для эфектыўнага прымянення

тэхналогіі дыферэнцыраванага навучання ў працэсе выкладання беларускай мовы і літаратуры ва ўмовах педагагічнага каледжа.

**Апрабацыя і апублікаванасць вынікаў:**

1. Итоги НИРС – 2003. VIII (53) научная конференция студентов, магистрантов и аспирантов. Сборник статей. – Витебск: Изд-во УО «ВГУ им.П.М.Машерова», 2004 – С. 71 – 72.
2. Качество высшего педагогического образования: проблемы и пути повышения: Материалы междунар. науч.-практ. конф. Минск, 15 апр. 2004г. / Редкол.: Н.А. Березовин (отв. ред.) и др. – Мн.: БГУ, 2004. – С. 229 – 231.
3. Проблемы развития педагогического образования: материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 17 дек. 2004г. / Бел. гос. пед. ун-т имени М.Танка; редкол.: К.В.Гавриловец [и др.]; отв. ред. А.В.Горохова, З.С.Курбыко. – Мн.: БГПУ, 2005. – С. 104 – 106.